

# Кадры вырашаюць усё

**Пытанні кадравага забеспячэння і падрыхтоўкі спецыялістаў абмеркавалі на калегіі Міністэрства культуры. Пасяджэнне прайшло 13 снежня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.**

З прывітальным словам да ўдзельнікаў звярнуўся міністр культуры Анатолій Маркевіч. У прамове ён зрабіў акцэнт на тым, што кадравая палітыка патрабуе асаблівай увагі. Кіраўнік галіны пазначыў праблемныя аспекты. Сярод іх — замацаванне маладых спецыялістаў, магчымасці заахвочвання творчай моладзі, мэтавая падрыхтоўка, прафарыентацыйная дзейнасць. Усе гэтыя ды іншыя пытанні сталі прадметам абмеркавання падчас пасяджэння калегіі.

— Сёння забяспечанасць кадрамі ў сферы культуры складае каля 96 %. Здавалася б, нядрэнны вынік, але трэба ісці значна далей, — адзначыў Анатолій Маркевіч. — Мы павінны выразна бачыць стройную сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў. А пачынаць прафарыентацыю трэба з вучняў школ. Таксама неабходна разабрацца, як нашых маладых спецыялістаў сустракаюць на месцах працы, якія створаны сацыяльна-бытавыя ўмовы і меры стымулявання. На першы погляд, гэтыя пытанні ляжаць на паверхні, але насамрэч яны патрабуюць вельмі сур'ёзнай дапрацоўкі.

На думку міністра, мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў таксама патрабуе сур'ёзнай мадэрнізацыі:

— Трэба аб'ектыўна ацаніць сітуацыю і выпрацаваць сістэму, якая дазволіць нам пакрокава вырашаць праблему кадраў, таму што без прафесіяналаў у сферы культуры нічога пазітыўнага не адбудзецца. У галіне павінны працаваць людзі, якія атрымалі спецыяльную адукацыю, ведаюць спецыфіку працы і бачаць патрэбны канчатковы вынік.

Анатолій Маркевіч таксама заўважыў, што гэта дазволіць рыхтаваць прафесіяналаў, якія на высокім узроўні будуць вырашаць задачы, пастаўленыя Кіраўніком дзяржавы і ўрадам.

— Галоўнае, каб у нашых установах культуры было цікава, гледачы адпачывалі душой, сэрцам і атрымлівалі асалоду ад таго, што прапануюць нашы калектывы, бо менавіта праз сферу культуры мы можам і павінны даносіць сапраўдныя каштоўнасці, якія з'яўляюцца асноватворнымі для чалавека, — падсумаваў міністр.

Па завяршэнні пасяджэння былі канкрэтызаваныя задачы і даручэнні, пазначаныя рашэнні калегіі і тэрміны для іх выканання.

Падрабязней — у наступным нумары.